# СТРУКТУРНЫЯ ТЫПЫ АЙКОНІМАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ З ЗОАКАМПАНЕНТАМ

**Грачыха Таццяна Антонаўна**
дацэнт кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава":
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Віцебск, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праблемы тапанімікі, у тым ліку і айканіміі, у сучаснай лінгвістыцы з'яўляюцца актуальнымі і шырока даследуюцца. Рэгіянальныя ўласныя назвы населеных пунктаў, суадносныя з найменнямі прадстаўнікоў жывёльнага свету, распаўсюджаны на тэрыторыі Віцебшчыны, аднак застаюцца недастаткова вывучанымі ў беларускім мовазнаўстве. Крыніцай для даследавання структурных асаблівасцей населеных пунктаў з заалагічным кампанентам паслужылі тапанімічныя і лінгвістычныя даведнікі, на аснове якіх быў сабраны і прааналізаваны айканімічны матэрыял [2, 3, 4, 5].

Багацце прыроды і фаўны Беларускага Паазер'я садзейнічала пашырэнню тыпу айконімаў, у аснову якіх пакладзены заалагічныя намінацыі: назвы жывёл, птушак, рыб, насякомых. Паводле структуры назвы населеных пунктаў, суадносныя з заонімамі, падзяляюцца на простыя, складаныя і састаўныя.

Простыя айконімы складаюцца з аднаго слова ў форме назоўніка ці прыметніка. Такія айконімы маюць форму адзіночнага ці множнага ліку. Сярод сабраных айканімічных адзінак большасць найменняў маюць форму назоўніка. Зафіксаваны адзінкавыя айконімы ў форме прыметнікаў множнага ліку: *Быкоўскія, Выдрыцкія, Мядзведскія, Пціцкія, Ракавыя.*

Асаблівасцю беларускай тапанімікі з'яўляецца пашырэнне назваў населеных пунктаў у форме назоўнікаў множнага ліку. У колькасных адносінах яны значна пераважаюць над простымі айконімамі [1, с. 13]. Гэта заканамернасць прасочваецца таксама ў айканіміі з зоакампанентам на тэрыторыі Беларускага Паазер'я. Айконімы множнага ліку з заалагічным кампанентам складаюць каля 47% ад агульнай колькасці простых назваў. Так, пашыранымі з'яўляюцца айконімы флексійнага ўтварэння апелятыўнага паходжання: *Бабры, Барсукі, Быкі, Ваўкі, Мядзведзі, Бараны, Кабаны, Казлы, Каты, Краты, Вараны, Вароны, Вераб'і, Голубы, Дзятлы, Дразды, Каршуны, Кулікі, Шпакі, Петухі, Карасі, Плоткі, Шчукі, Жукі, Шаршні, Камары* і інш. Распаўсюджанымі таксама з'яўляюцца простыя айконімы множнага ліку суфіксальна-флексійнага тыпу: *Арловічы, Арляны, Блошнікі, Бобрыкі, Бычкі, Варонічы, Ваўкавічы, Ваўчкі, Галубічы, Зайчонкі, Зубрэвічы, Кроцікі, Каршункі, Жучкі, Кароўнікі, Ластавікі, Мядзведнікі, Сакольнікі, Скварцішкі, Петушкі, Рыбачкі, Ракаўцы* і інш.

Сярод простых айконімаў з зоакампанентам адзіночнага ліку адзначаны нешматлікія назвы населеных пунктаў безафіксальнага ўтварэння: *Ваўчо, Ваўча, Казёл, Барсук.* Больш пашыранымі з'яўляюцца айконімы афіксальнага ўтварэння з суфіксальнымі элементамі -к-, -н-, -в-: *Арлоўка, Лосеўка, Курмялёўка, Бабро́ўшчына, Быкоўшчына, Ваўкоўшчына, Барсучына, Вароніна, Карасіна, Завыдрына, Зарыбіна, Баброва, Быкава, Ласёва, Шпакава, Скварцова, Салаўёва, Угрова.* Дадзеныя айконімы ўспрымаюцца як назоўнікі ў форме мужчынскага роду *(Казёл, Барсук)*, жаночага роду *(Бабро́ўшчына, Лосеўка)*, ніякага роду *(Арлова, Баброва)*. Назоўнікі ніякага роду з'яўляюцца найбольш пашыранымі сярод простых айконімаў адзіночнага ліку.

Складаныя айконімы – аднаслоўныя ўтварэнні, якія маюць некалькі каранёў. На тэрыторыі Віцебшчыны адзначана некалькі складаных айконімаў з зоакампанентам, утвораных з дапамогай асновакладання на базе спалучэння прыметніка і назоўніка: *Казігорка* < *Казіная горка, Белахвостава* < *Белы хвост.* Таксама зафіксаваны айконімы-кампазіты, утвораныя на аснове словаскладання: *Обаль-Барсучына, Гуры-Дразды, Луцк-Казлоўск.* Яны складаюцца са структурна самастойных слоў.

Састаўныя айконімы ўяўляюць спалучэнне двух і болей слоў. У іх структуру ўваходзяць два кампаненты – суб'ект і атрыбут, выражаныя назоўнікам і прыметнікам і звязаныя падпарадкавальнай сувяззю.

На тэрыторыі Віцебскай вобласці намі вылучана 17 двухслоўных найменняў, у якіх атрыбутыўны кампанент знаходзіцца ў прэпазіцыі: *Запольскія Камары, Горныя Жукі, Ложныя Жукі, Новае Саколіна, Старое Саколіна, Вялікія Барсучыны, Малыя Барсучыны, Новая Барсучына, Барсучы Мох, Ластавіцкі Абруб, Воўча Доля, Лосся Яма, Коззі Горкі, Казінае Сяло, Вялікая Выдрэя, Малая Выдрэя, Старыя Крукі* (дыялектнае *крук* 'крумкач'). Сярод састаўных назваў населеных пунктаў з заалагічным кампанентам сустракаюцца айконімы з апазіцыйнымі адносінамі, у якіх атрыбутыўны кампанент мае размежавальную функцыю і можа ўказваць на час узнікнення айконіма (*Новае Саколіна, Старое Саколіна, Новая Барсучына, Старыя Крукі)*, на памер *(Вялікія Барсучыны, Малыя Барсучыны, Вялікая Выдрэя, Малая Выдрэя)*, на асаблівасці рэльефу *(Горныя Жукі, Ложныя Жукі)*. У апошнім выпадку апазіцыйныя адносіны *горны – ложны* размяжоўваюць месцазнаходжанне вёсак Шкунціўскага сельсавета Шаркаўшчынскана раёна: адна размешчана высока – на гары, а другая нізка – у лагу. Атрыбутыўны кампанент можа выражацца прыналежным прыметнікам з указаннем на ўладальніка аб'екта: *Запольскія Камары, Барсучы Мох, Ластавіцкі Абруб, Воўча Доля, Лосся Яма.* У прааналізаваным матэрыяле зафіксаваны адзін айконім, утвораны па мадэлі "назоўнік+назоўнік": *Востраў Лешч.*

Такім чынам, назвы населеных пунктаў з заалагічным кампанентам з'яўляюцца распаўсюджанымі на тэрыторыі Віцебшчыны. Моўны аналіз



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

айконімаў дазволіў вылучыць сярод іх простыя, складаныя і састаўныя структурныя тыпы. У колькасных адносінах пераважаюць простыя айконімы множнага ліку. Найбольш прадуктыўным спосабам словаўтварэння састаўных айконімаў з'яўляецца мадэль "прыметнік + назоўнік". На аснове атрыбутыўнага кампанента можна меркаваць пра рэльеф, памеры, час узнікнення вёскі, яе ўладальніка. На Віцебшчыне выяўлены адзінкавыя айконімы-кампазіты з заалагічным кампанентам, што ўказвае на непрадуктыўнасць гэтага структурнага тыпу.

**Літаратура**


1. Генкин, В. М. Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья : учебно-методическое пособие / В. М. Генкин. – Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2009. – 115 с.
2. Генкін, У. М. Слоўнік адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны / У. М. Генкін. – Віцебск : Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2005. – 235 с.
3. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь / В. А. Жучкевич.– Минск : Издательство БГУ, 1974. – 448 с.
4. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Віцебская вобласць : нарматыўны даведнік / У М. Генкін, І. Л. Капылоў, В. П. Лемцюгова, пад рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 668 с.
5. Рапановіч, Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці / рэд. П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 504 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова